***Вяргеенка С.А.***
*кандидат філалагічных навук*
*дацэнт кафедры беларускай мовы*
***Панкова Н.М.***
*старшы выкладчык кафедры беларускай мовы*
*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны*
*Рэспубліка Беларусь*

# МЕТАДЫ СТЫМУЛЯВАННЯ СТУДЭНТАЎ ВНУ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» вывучаюць на ўсіх негуманітарных факультэтах, у асноўным на першым курсе. Гэта апраўдана, бо студэнтам, якія толькі ўключаюцца ў навучальны працэс, прасцей адаптавацца да новых умоў, калі спецыяльныя прадметы разбаўлены сацыяльна-гуманітарнымі дысцыплінамі. Гэты курс ўспрымаецца студэнтамі-нефілолагамі неадназначна, што звязана ў першую чаргу з тым, што пераважная большасць насельніцтва нашай краіны карыстаецца рускай мовай для штодзённых зносін. Да таго ж абітурыенты часцей выбіраюць яе на цэнтралізаваным тэсціраванні. Апытанне студэнтаў-першакурснікаў паказвае, што ўсе вышэй названыя факты вымушаюць зніжаць увагу да беларускай мовы ў старэйшых класах.

Сучасныя тэндэнцыі (трэнды) развіцця адукацыі вымушаюць да пошуку новых падыходаў у выкладанні матэрыялу, ацэнцы ведаў студэнтаў і метадаў стымулявання іх вучэбна-пазнаваўчай дзейнасці. Прычым, апошняе адыгрывае вызначальную ролю ў працэсе навучання, бо студэнты павінны ведаць, што іх чакае ў выніку вывучэння дысцыпліны. У сучаснай метадычнай навуцы выкарыстоўваюцца розныя метады стымулявання, такія як, напрыклад, эмацыйнага стымулявання, развіцця пазнавальнай цікавасці, фарміравання адказнасці і абавязковасці і інш. Шырока выкарыстоўваецца таксама і новая, даволі прагрэсіўная сістэма, якая заключаецца ў замене традыцыйнага дыскрэтна-сесійнага кантролю на рэйтынгавую сістэму, пры якой у перыяд навучання і на этапах прамежкавага кантролю бесперапынна набіраюцца балы. Такая сістэма ацэнкі ведаў называецца бальна-рэйтынгавай. Яна матывуе да сістэмнай працы, дазваляе стымуляваць навучальную дзейнасць студэнтаў, а таксама павышае аб’ектыўнасць выніковай адзнакі. Рэйтынгавая адзнака можа быць вылічана па формуле: В=Ах10/М, дзе В – выніковая адзнака, М – максімальна магчымая колькасць балаў па ўсіх тэмах, А – агульная колькасць балаў, набраных студэнтамі за семестр. Такім чынам, студэнты дакладна ведаюць, на што яны могуць разлічваць у час залікова-экзаменацыйнай сесіі.

Рэйтынгавая сістэма дапамагае выбудоўваць прыярытэты сістэмы стымулявання студэнтаў для дасягнення найлепшых вынікаў у навучанні. Яна «здольна надаваць пэўную цэласнасць разнастайным методыкам (класічнага і інавацыйнага статусу), падпарадкоўваючы іх мэтавым арыенцірам выкладання» [1, с. 34].

Разгледзім, як можна прымяняць рэйтынгавую сістэму пры выкладанні дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». У сувязі з гэтым, на нашу думку, на першай пары неабходна дакладна растлумачыць змест дысцыпліны, яе прафесійную накіраванасць, патрабаванні, якія будуць прымяняцца да студэнтаў, а таксама сутнасць рэйтынгавай сістэмы, якая непасрэдна ўплывае на магчымасць атрымання «аўтаматаў».

На занятках па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей намі ўжо выкарыстоўваецца рэйтынгавая ацэнка ведаў студэнтаў. Яе ўкараненню ў вучэбны працэс папярэднічаў этап распрацоўкі і апрабацыі. У выніку студэнты, якія вучыліся па рэйтынгавай сістэме, былі больш зацікаўленымі ў выніках сваёй работы, пастаянна рыхтаваліся да заняткаў, імкнуліся выканаць як мага больш практыкаванняў, прапанаваных па тэме. Гэтая сістэма знайшла адлюстраванне ў электронным вучэбна-метадычным комплексе па названай дысцыпліне [2]. Для студэнтаў распрацаваны практыкаванні па кожнай тэме ў адпаведнасці з праграмай курса. Кожная тэма «каштуе» пэўную колькасць балаў у залежнасці ад складанасці і колькасці прапанаваных практыкаванняў для самастойнай (пры падрохтоўцы дома) і групавой (на практычных занятках) працы. Пры гэтым трэба ўлічваць, што ў кожнай рэйтынгавай сістэме існуюць пэўныя супярэчнасці, якія могуць быць выкліканы разнастайнымі прычынамі. Напрыклад, розныя здольнасці студэнтаў, неаднолькавыя ўмовы навучання ў школах, разыходжанне мэтаў суб’ектаў адукацыйнага працэсу. Толькі апрабаваўшы на практыцы той ці іншы рэйтынгавы варыянт магчыма ацаніць яго вартасці і недахопы.

Прывядзем для прыкладу «разбалоўку» некаторых тэм курса. Так, на вывучэнне тэмы «Арфаграфічныя нормы беларускай літаратурная мовы» праграмай адводзіцца 4 гадзіны. Зразумела, што ўсе правілы беларускай арфаграфіі за гэтую колькасць гадзін паўтарыць немагчыма, таму мы спыняемся на найбольш цяжкіх выпадках і на тых правілах, выкарыстанне якіх спатрэбіцца студэнтам у іх далейшым навучанні. Пералік вывучаемых пытанняў уключае правапіс галосных, правапіс зычных, правапіс мяккага знака і апострафа, правапіс вялікай і малой літар. Падчас працы над гэтай тэмай таксама звяртаецца ўвага на асаблівасці беларускай арфаграфіі ў параўнанні з рускай (дарэчы, нягледзячы на тое, што нашы студэнты ўсё ж такі больш

карыстаюцца рускай мовай і лічаць, што рускую мову яны ведаюць лепш, пры выкананні заданняў, звязаных з параўнаннем моўных нормаў абедзвюх моў дапускаюць памылкі як пры выкарыстанні беларускай, так і рускай мовы). Агульны «кошт» гэтай тэмы – 35 балаў, тэма ўключае 12 заданяў, кожнае з якіх у адпаведнасці са складанасцю «каштуе» ад 1-го да 5-ці балаў. Праца над тэмай заключаецца ў паўтарэнні асноўных правілаў і выкананні практыкаванняў. У сціслым выглядзе правілы прапанаваны ў першай, тэарэтычнай, частцы комплекса, што дае магчымасць студэнтам падрыхтавацца да заняткаў, не звяртаючыся да іншых крыніц, тым больш, што ў вельмі рэдкіх выпадках студэнты самастойна выкарыстоўваюць дадатковы матэрыял.

У практычнай частцы студэнтам прапануецца ўставіць прапушчаныя галосныя (правапіс О, А, Э; Е, Ё, Я – кошт задання 4 балы, а таксама правапіс складаных слоў – кошт задання 3 балы); уставіць прапушчаныя літары пасля прыставак (правапіс І, Ы, Й пасля прыставак – кошт задання 3 балы); уставіць мяккі знак ці апостраф (правапіс мяккага знака і апострафа – кошт задання 3 балы); перакласці словы на беларускую мову (правапіс спалучэнняў галосных і правапіс спалучэнняў зычных – кошт кожнага задання па 2 балы). Выконваюцца таксама заданні на правапіс Ў (кошт задання 1 бал), прыстаўных гукаў і вялікай літары (кошт кожнага задання па 2 балы). У межах гэтай тэмы таксама прапануецца заданне на правапіс прыметнікаў з суфіксам -ск-: студэнтам неабходна ад назоўнікаў утварыць адносныя прыметнікі і растлумачыць правапіс спалучэнняў зычных (кошт задання 3 балы).

Не абыходзім увагай на занятках і працу з тэкстам. Для такой працы студэнты рыхтуюць тэксты, звязаныя з іх будучай прафесійнай дзейнасцю. У межах абранай намі для разгляду тэмы прапануецца ў падрыхтаваным тэксце знайсці і выпісаць прыклады на асноўныя арфаграфічныя правілы. Такія тэксты выпрацоўваюць арфаграфічную зоркасць, паказваюць, як можна прымяняць тэрміналагічную лексіку ў тэкстах розных стыляў. Акрамя таго, у комплексе прапануюцца гатовыя фрагменты тэкстаў для перакладаў. Пасля перакладу студэнты павінны прааналізаваць тэкст і вызначыць, правапіс якіх слоў заснаваны на фанетычным прынцыпе, а якіх – на марфалагічным (кошт кожнага задання з тэкстам па 5 балаў).

Пры выкананні некаторых заданняў па тэме «Арфаграфічныя нормы беларускай мовы» студэнты дапускаюць памылкі, што паніжае «кошт» выкананага імі задання. Напрыклад, пры перакладзе на беларускую мову прафесійнага тэксту сустракаюцца памылкі на дапасаванне назоўнікаў і прыметнікаў. Гэта часта звязана з несупадзеннем роду назоўнікаў у рускай і беларускай мовах. Напрыклад, «всемирная торговля» (рус. – ж.р.) – «сусветны гандаль» (бел. – м.р.) і пад. Зразумела, што за такі пераклад (пераклад з

памылкамі) студэнт не можа атрымаць максімальную колькасць балаў. У такім выпадку бал зніжаецца прапарцыйна колькасці дапушчаных памылак.

Па частотнасці дапускаемых памылак вылучаецца заданне на ўтварэнне адносных прыметнікаў ад назоўнікаў. Студэнты блытаюць выпадкі захавання некаторых зычных асновы перад суфіксам -ск- і сцяжэння зычных з суфіксальным С: напрыклад, *завод – завадскі*, *мастак – мастацкі* і пад. Вопыт паказвае, што за такое заданне студэнты атрымліваюць мінімальны бал.

Агульнавядома, што эфект навучання залежыць ад выбару аптымальнага спалучэння метадаў, прыёмаў і прынцыпаў навучання. Існуюць таксама правілы навучання, якія выцякаюць з прынцыпаў і канкрэтызуюць іх. Немалаважнай пры гэтым з'яўляецца ацэнка ведаў, бягучы і выніковы кантроль ведаў студэнтаў. На занятках па беларускай мове на нефілалагічных спецыяльнасцях прыходзіцца шукаць новыя, нестандартныя рашэнні, прыёмы і метады навучання, каб студэнты асэнсавалі мову як форму выражэння нацыянальная культуры, нацыянальна-культурнай спецыфікі маўленчых паводзін, у дастатковым аб'ёме засвоілі прафесійную лексіку. Для гэтага выкарыстоўваюцца разнастайныя віды работ: пераклады, пераказы, вусныя выказванні, гутаркі-дыскусіі, лінгвістычныя гульні і інш., што дапамагае студэнтам не толькі паўтарыць школьныя веды, а і пашырыць свой лексічны запас, набыць навыкі звязнага беларускага маўлення, у тым ліку, па сваёй спецыяльнасці. Варта адзначыць, што найбольш эфектыўным і цікавым для студэнтаў метадам навучання беларускай мове, на нашу думку, з'яўляецца метад навучання ў супрацоўніцтве, пры якім студэнты працуюць у невялікіх групах і адказваюць за канчатковы вынік разам. Галоўнае пры гэтым метадзе не выконваць разам, а вучыцца разам, г.з. на першым месцы павінна стаяць супрацоўніцтва, а не спаборніцтва.

Абагульняючы сказанае вышэй пра метады навучання і формы кантролю ведаў, адзначым, што ніводны з іх не выкарыстоўваецца ў працэсе навучання адзін. У вучэбнай дзейнасці заўсёды спалучаецца некалькі метадаў. Яны як бы ўзаемапранікаюць адзін у другі, харатарызуючы з розных бакоў адно і тое ж узаемадзеянне выкладчыкаў і навучэнцаў.

Такім чынам, выкарыстанне рэйтынгавай сістэмы як формы кантролю ведаў відавочна патрабуе ад выкладчыкаў дадатковых намаганняў: падрыхтоўкі вялікай колькасці матэрыялу па падрыхтоўцы модульных і экзаменацыйных работ. Але яна дае і відавочныя плюсы: зніжае ролю выпадковасцяў пры здачы заліку; стымулюе паўсядзённую сістэматычную працу студэнтаў; ацэньвае рэальнае месца, якое займае студэнт сярод сакурснікаў у адпаведнасці са сваімі поспехамі; стварае аб'ектыўныя крытэрыі пры вызначэнні кандыдатаў на працяг навучання (магістратура, аспірантура і г. д.).

*Література*

1. Ермакова Л.Д. Агульныя асновы педагогікі: практычны дапаможнік / склад. Л.Д. Ермакова; Міністэрства адукацыі РБ, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. Гомель: ГГУ ім. Ф. Скарыны, 2013. 44 с.
2. Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». URL : http://dot.gsu.by/course/view.php?id=384.

***Галчанська В.В.***
*студентка магістрантури*
*Мелітопольський державний педагогічний університет*
*імені Богдана Хмельницького*

## МАЛА ПРОЗА БОГДАНА ЛЕПКОГО: ХУДОЖНІ ОСОБЛИВОСТІ СЮЖЕТОТВОРЕННЯ

***Анотація.*** *У науковому дослідженні подано особливості малої прози Богдана Лепкого. Робиться акцент на поетикальних елементах в новелах та оповіданнях письменника. Наголошується на тому, що у художніх творах Богдан Лепкий головний інтерес зосереджував на подіях, а характер проявляв через подію. Глибина розкриття складного духовного світу людини, сила соціально-психологічної типізації, досягнуті в оповіданні Б. Лепкого, стали художнім відкриттям нових можливостей в українській літературі XX ст.*

***Ключові слова:*** *новела, оповідання, художня творчість, поетика, духовний світ людини.*

Одним з провідних письменників української літератури XX ст. є Б. Лепкий, який відзначився як засновник сюжетоскладання. Сюжети творів письменника разюче відрізнялись від творів інших письменників, адже Б. Лепкий створював динамічний розвиток подій у творі з несподіваною кінцівкою, чим і підсилював трагічну долю галицького селянина, який все життя беріг на смерть «п’ятку», а вона виявилась «невдалою» [2, с. 3]. Письменник використовував різноманітну образність сюжетів творів, наприклад оповідання «Нездала п’ятка», у ньому висвітлено курйозний випадок. Життєвий та творчий шлях Б. Лепкого вивчається в загальноосвітніх закладах та й у вищих навчальних, оскільки за допомогою, його творчості здобувачі освіти обирають майбутній шлях свого життя [7, с. 149]. Та щоб осягнути нововведення Б. Лепкого в українську літературу необхідно мати